# ФЕСТЫВАЛІ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ Ў ПРАСТОРЫ КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ БЕЛАРУСІ

Адраджэнне фестывалю як з'явы культурнага жыцця ў еўрапейскім грамадстве адбылося на мяжы XIX і XX стст. Гэта стала вынікам з'яўлення новай гарадской культуры, развіццё якой вызначалі сродкі масавай камунікацыі – газеты, часопісы, радыё, гукапіс, кіно, а ў пасляваенны перыяд – тэлебачанне.

Бурнае развіццё новых інфармацыйных тэхналогій радыкальным чынам адбілася на арганізацыйных формах функцыянавання выканальніцкіх мастацтваў. Актуалізацыя фестывальнай дзейнасці з падкрэслена святочнай рытуальнай атмасферай, жаданнем зрабіць кожны спектакль або канцэрт унікальнай падзеяй, якія выходзяць за рамкі звыклай мастацкай практыкі, адказвала новым грамадскім патрэбам у абнаўленні камунікатыўных працэсаў.

Разам з фарміраваннем новага міжнароднага палітычнага парадку гэта прывяло і да складання агульнаеўрапейскай культурнай прасторы, у якім сетка найбуйнейшых міжнародных фестываляў стала выконваць важную інтэграцыйную ролю ў якасці прэстыжнага поля для артыстычнага абмену, дэманстрацыі лепшых дасягненняў нацыянальных культур.

Сёння міжнародныя, рэспубліканскія і рэгіянальныя фестывалі з'яўляюцца важным кірункам у стымуляванні і развіцці народнай мастацкай творчасці сучаснай Беларусі. Фестывальныя мерапрыемствы заўсёды адлюстроўваюць узровень развітасці пэўных відаў і жанраў мастацтва, характарызуюцца комплексным характарам вырашэння мастацка-эстэтычных, сацыяльна-педагагічных, навукова-метадычных, матэрыяльна-тэхнічных задач.

Практыка сведчыць, што на працягу апошніх 30 гадоў (1991–2020) фестывальная дзейнасць заставалася адной з найбольш эфектыўных форм захавання, развіцця і папулярызацыі народнага мастацтва, і абапіраецца на лепшыя традыцыі фестываляў і аглядаў савецкага часу. Так, галоўным фестывальным мерапрыемствам можна лічыць фестываль народнага мастацтва «Беларусь – мая песня» (1997–1998, 2004–2005). Місія гэтага фестывалю была ў тым, каб забяспечыць уцягванне насельніцтва ў працэс бесперапыннай мастацкай асветы сродкамі мастацтваў, уключэнне асобы ў стварэнне каштоўнасцей мастацкай культуры, паслядоўнае фарміраванне яе эстэтычных пачуццяў і ідэалаў, зацвярджэнне духоўна насычаных форм адпачынкавых зносін.

Суб'ектамі фестывальных ініцыятыў у галіне народнай мастацкай творчасці часцей за ўсё з'яўляюцца ўстановы Міністэрства культуры, Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, сістэмы адукацыі, а таксама грамадскія аб'яднанні, нацыянальна-культурныя аб'яднанні. У якасці цэнтральнага каардынацыйнага органа фестывальнай дзейнасці выступае Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Сярод шматлікіх задач, якія вырашаюцца падчас арганізацыі і правядзення фестывалю, вызначаюцца наступныя:

скіраванне ўвагі дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, устаноў культуры, творчых саюзаў, дабрачынных фондаў, дзеячаў культуры і мастацтва да праблем захавання нацыянальнай культуры, эстэтычнага выхавання дзяцей і моладзі на прыкладзе лепшых узораў традыцыйнага мастацтва;

далучэнне шырокага кола насельніцтва да беларускай народнай культуры;

распаўсюджванне перадавога вопыту, традыцыйных методык вырабу твораў народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, валодання музычнымі інструментамі, выканальніцтва ў аўтэнтычнай манеры і г. д.;

узбагачэнне і развіццё традыцыйных відаў і жанраў мастацтва;

папулярызацыя лепшых мастацкіх узораў нацыянальнага мастацтва;

вывучэнне стану і тэндэнцый развіцця традыцыйных і сучасных відаў і жанраў мастацкай творчасці;

аналіз праблем, якія ўзнікаюць на шляху вывучэння, захавання, распаўсюджвання каштоўнасцей беларускай культуры.

Спалучэнне традыцый і навацый у фестывальнай дзейнасці выклікае ў гледачоў і гасцей цікавасць і станоўчы рэзананс. Прымальнасць і прыцягальнасць мастацкіх ідэй, пакладзеных у аснову фестывальных акцый, з'яўляецца ўмовай іх укаранення ў тым ці іншым рэгіёне, а само мерапрыемства можа разлічваць на моцную грамадскую падтрымку. Да такіх культурных ініцыятыў з прыхільнасцю ставіцца мясцовая адміністрацыя, знаходзіцца падтрымка з боку вытворчых прадпрыемстваў і прадпрымальніцкіх структур. Такая комплексная методыка арганізацыі фестывальнай дзейнасці, безумоўна, спрыяе аб'яднанню намаганняў розных грамадскіх структур і скіраванню інтэлектуальных, фінансавых, арганізацыйных і кадравых рэсурсаў на вырашэнне асабліва важных праблем у рэгіёне.

Рэальным укладам у фарміраванне іміджу нашай краіны, важным творчым стымулам для прафесійных і аматарскіх калектываў, эфектыўнай формай прапаганды беларускага мастацтва сталі фестывалі, якія ўжо даўно з'яўляюцца сапраўднай візітоўкай культуры Беларусі: «Славянскі базар у Віцебску», «Залаты шлягер» (Магілёў), «Званы Сафіі» (Полацк), «Белая вежа» (Брэст), «Мінская вясна», «Беларуская музычная восень» і «Лістапад» (Мінск).

Штогод у рэгіёнах Беларусі праводзіцца каля 50 фестываляў і свят. Народную мастацкую творчасць эфектыўна падтрымліваюць фестывалі, якія сталі традыцыйнымі на міжнародным узроўні: народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» (Паставы), народнай творчасці «Вянок дружбы» (Бабруйск), юных талентаў «Зямля пад

белымі крыламі» (Мазыр), духоўнай музыкі «Магутны Божа» (Магілёў), дзіцячай творчасці «Залатая пчолка» (Клімавічы), этнакультурных традыцый «Кліч Палесся» (Ляскавічы), харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» (Гомель), гістарычнай рэканструкцыі «Мінск старажытны», духавой музыкі «Беларускія фанфары» (Баранавічы) і інш.

Работнікі ўстаноў культуры шчыра зацікаўлены становішчам і лёсам культуры Беларусі. Гэта яскрава пацвярджаюць і рэспубліканскія фестывалі: фальклорнага мастацтва «Берагіня» (Акцябрскі), народнага гумару «Аўцюкі» (Калінкавічы), маладых эстрадных выканаўцаў «Белазаўскі акорд» (Жодзіна), харавога мастацтва «Пеўчае поле» (Мядзел), народнай творчасці «Вясновы букет» (Мінск). Амаль чвэрць стагоддзя налічвае традыцыя правядзення ў горадзе над Нёманам Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, у якім прымаюць удзел лепшыя разнажанравыя калектывы і індывідуальныя выканаўцы нацыянальна-культурных грамадскіх аб'яднанняў.

Працэс фарміравання фестывальных традыцый ідзе актыўна як на рэспубліканскім, так і рэгіянальным узроўнях. Месцам правядзення фестываляў і турніраў сярэдневяковай культуры сталі гарады з багатай гісторыяй – Мсціслаў, Нясвіж, Ліда, Заслаўе. Маштабнасць і тэатральную відовішчнасць набыў фестываль сярэдневяковай культуры «Наваградскі замак», які ў 2000 г. упершыню адбыўся ў старажытнай сталіцы Вялікага Княства Літоўскага. Рэгіёны рэспублікі ганарацца таксама сваімі фестывалямі сямейнай творчасці, бардаўскай песні, харэаграфічнага і тэатральнага мастацтва, паэтычнай творчасці, традыцыйных рамёстваў.

Сацыяльная значнасць фестывальнай дзейнасці ў сферы народнай мастацкай творчасці і мэтазгоднасць яе пашырэння і паглыблення выражаецца ў тым, што фестывальныя мерапрыемствы адраджаюць забытыя пласты нацыянальнай і сусветнай культуры, стымулююць усе віды творчай актыўнасці, павышаюць прэстыж і імідж мясцовасці, садзейнічаюць ажыўленню сувязей паміж рэгіёнамі, спрыяючы тым самым фарміраванню адзінай культурнай прасторы.

У апошняе дзесяцігоддзе фестывальныя праекты ўстаноў культуры арыентаваны на нацыянальную ідэю. Пошукам і фарміраваннем культурных брэндаў пачалі займацца ледзь не ў кожным рэгіёне. Фестывальная дзейнасць стала патрабаваць больш пільнай ўвагі з боку гісторыкаў, культуролагаў, сацыёлагаў, эканамістаў.

Сёння ў Беларусі сфарміраваліся рэгіянальныя культурныя брэнды, якія адлюстроўваюць мясцовыя традыцыі, адраджаюць аб'екты нематэрыяльнай культурнай спадчыны, гісторыю вёсак, гарадоў і іх адметную асаблівасць, увекавечваюць справу сваіх знакамітых продкаў. Такім чынам, з'явіўся новы кірунак – культурны турызм. Сваю ўнікальную нішу, якая садзейнічае прытоку турыстаў і прыхільнікаў даўніны, знайшлі многія рэгіёны, якія сталі пляцоўкамі для брэндавых фестываляў: «Слуцкія паясы» (Слуцк), «Вістыцкі яблык» (Брэсцкі р-н), «Вішнёвы фестываль» (Глыбокае), «Гаспадарчы сыр» (Слаўгарад), «Крычаўскі канёк» (Крычаў), «Дзень варэння» (Чэрыкаў), «Свята агурка» (Шклоўскі р-н), «Сенафэст» (Кіраўскі р-н), «Мотальскія прысмакі» (Іванаўскі р-н), «Дрыбінскія таржкі» (Дрыбін), «Свята караваю» (Дзятлаўскі р-н), «Юраўскі карагод» (Жыткавіцкі р-н), «Адвечная ягада журавіна» (Столінскі р-н), «Бярэзінскія лыжкары» (Беразіно), «Спораўскія жарты» (Бярозаўскі р-н) і інш. Фестываль як прэстыжная з'ява ў культурным жыцці рэгіёна ўключаецца ў складаныя працэсы функцыянавання мясцовай эканомікі, з'яўляецца важным фактарам яе развіцця. Дзяржаўныя і мясцовыя органы ўлады на ўзроўні сваёй кампетэнцыі ствараюць адпаведныя ўмовы для дэманстрацыі творчых дасягненняў. Правядзенне фестывальных мерапрыемстваў патрабуе адпаведнага ўзроўню развіцця гарадской інфраструктуры, стымулюе яе ўдасканальванне і пашырэнне. Напярэдадні іх праводзіцца рамонт і рэканструкцыя аб'ектаў камунальнай уласнасці – гасцініц, інтэрнатаў, прадпрыемстваў грамадскага харчавання, добраўпарадкуюцца вуліцы, паркі, скверы, прыводзяцца ў належны выгляд іншыя месцы масавага знаходжання гасцей.

Фестывальная дзейнасць разглядаецца як эфектыўны інструмент фарміравання брэндаў тэрыторый, рэальных зносін з насельніцтвам гэтых тэрыторый і з'яўляецца моцным фактарам станоўчага ўздзеяння на сацыяльна-культурнае асяроддзе рэгіёнаў. Фестывальная акцыя прадугледжвае наяўнасць сваёй аўдыторыі, на якую арыентавана яго мастацкая канцэпцыя, і адрозніваецца асаблівай атмасферай свята, арыентацыяй на паказ лепшых мастацкіх калектываў і выканаўцаў, арыгінальнасцю рэпертуару, адрознага ад рэпертуару стацыянарных калектываў.

Практыка паказвае, што пры належнай арганізацыі грамадска-культурнага жыцця і кіравання мастацка-культурнай дзейнасцю фестывалі могуць стаць эфектыўнай формай захавання і развіцця рэгіянальнай святочна-абрадавай культуры, гісторыка-культурнай спадчыны, моцным рэсурсам развіцця рэгіёна.

Такім чынам, фестывалі народнай мастацкай творчасці ў Беларусі выконваюць сваю асноўную задачу – узнаўляюць культурныя традыцыі, узбагачаюць культурнае жыццё краіны, рэгіёна, горада, ствараюць максімальна шырокае поле прыцягнення як для прафесіяналаў у розных галінах творчасці, так і самай шырокай аўдыторыі гледачоў і слухачоў да беларускай і сусветнай мастацкай культуры.

Алена МАКАРАВА,
загадчык кафедры менеджменту
сацыяльна-культурнай дзейнасці
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
культуры і мастацтваў»,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт

Святлана МАЙСЯЙЧУК,
прафесар кафедры менеджменту
сацыяльна-культурнай дзейнасці
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
культуры і мастацтваў»,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт